# «МАСТАЦКАЕ СЛОВА»

Так называўся конкурс літаратурнай творчасці, які праходзіў у межах фестывалю «Студэнцкая вясна» ў актавай зале мастацка-графічнага факультэта нашай ВНУ. Пераможцаў вызначалі ў дзвюх намінацыях: «Аўтар літаратурнага твора» і «Выканаўца літаратурнага твора».

Удзельнікаў было ўсяго дванаццаць: Максім Матвееў (факультэт фізічнай культуры і спорту), Аляксадра Лях, Уладзіслаў Улаховіч, Анастасія Лісоўская (гістарычны факультэт), Мікіта Кабышка (юрыдычны факультэт), Юлія Гарбачэва, Вікторыя Лукашэвіч, Лізавета Ланіна (філалагічны факультэт), Ганна Скрыпкіна, Азур Бахрамаў (факультэт матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій), Вераніка Спірыдонава (факультэт сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі) і Дар'я Пышка (біялагічны факультэт).

Ацэньвалі талент хлопцаў і дзяўчат дацэнты кафедры літаратуры Алена Уладзіміраўна Крыклівец і Ганна Віктараўна Навасельцава, загадчык аддзела арганізацыйна-выхаваўчай і інфармацыйнай дзейнасці Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Таццяна Віктараўна Кавака і кіраўнік тэатральнай студыі «Буклерон»Таццяна Георгіеўна Кутэнка.



Напрыканцы конкурсу літаратурнай творчасці Таццяна Віктараўна адзначыла, што ўсе яго ўдзельнікі паказалі сябе вельмі таленавітымі, разнапланавымі, яркімі, цікавымі асобамі, і пажадала, каб такія мерапрыемствы праходзілі як мага часцей і каб у іх удзельнічала большая колькасць студэнтаў.

Па выніках конкурсу дыпломам пераможцы ў намінацыі «Аўтар літаратурнага твора» атрымала студэнтка педагагічнага факультэта Карына Пяткевіч. Дыпломамі трэцяй ступені ў намінацыі «Выканаўца літаратурнага твора» ўзнагароджаны студэнтка гістарычнага факультэта Анастасія Лісоўская і студэнтка факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі Вераніка Спірыдонава, дыпломам другой ступені – студэнт гістарычнага факультэта Уладзіслаў Улаховіч. Пераможцай у гэтай намінацыі была названа студэнтка філалагічнага факультэта Юлія Гарбачэва.

**Наталля ЕРМАКОВА, студэнтка 1-га курса ФлФ.**

**На здымку:** У. Улаховіч, студэнт гістарычнага факультэта.

**Фота В. ЛУЗГІНОЙ.**